Дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Раснянская сярэдняя школа»
Камянецкага раёна

# Школьны музей дэкаратыўна – прыкладной творчасці

Кіраўнік музея: Шэптур Вераніка Аляксандраўна
Удзельнікі савета музея: Каваленка Маргарыта, 10 клас
Дзік Дар’я, 10 клас
Хмялеўская Аліна, 8 клас

# Змест:

- Як добра, што музей наш ёсць у школе!
- Гісторыя заснавання музея
- Фонд музея
- Экскурсія «Школьны музей дэкаратыўна - прыкладной творчасці»
- Віктарына

Як добра, што музей наш ёсць у школе!
Значыць, сувязь з часам не згубіць.
Значыць, разам на жыццёвым коле
Зможам мы мінулае ўзнавіць.

Ты ў музей прыйшоў – і ты ўжо ў мінулым,
Бы гады перад вачыма паплылі.
Паглядзі навокал і падумай:
Продкі твае гэтак жа жылі.

Няхай сцяжынка ў музей не зарастае,
Няхай гісторыі не дасць забыць,
Няхай кожны тут усведамляе –
Будучыні без мінулага не можа быць!

# Школьны музей дэкаратыўна – прыкладной творчасці

Запрашаем Вас у наш **школьны музей дэкаратыўна - прыкладной творчасці**.

Пачаў ён сваё існаванне 6 мая 1988 года. Заснавальнікам і першым кіраўнікам музея была Блінова Раіса Іванаўна. У заснаванні музея прымалі ўдзел усе: вучні, бацькі, настаўнікі. Затым кіраўнікам музея стала настаўніца гісторыі Дубіна Наталля Іванаўна. З 2006 года – настаўніца беларускай мовы і літаратуры Міснік Ніна Васільеўна. Зараз кіраўнік музея настаўніца беларускай мовы і літаратуры Шэптур Вераніка Аляксандраўна.

# Школьны музей дэкаратыўна – прыкладной творчасці

Наш музей мае этнаграфічную накіраванасць, налічвае 145 экспанатаў ( з якіх 100 асноўнага фонду).

**Асноўныя аддзелы экспазіцыі:**

- Ткацтва
- Вышыўка
- Пляценне
- Вырабы з ільну
- Сучасная дэкаратыўна-прыкладная творчасць

# Школьны музей дэкаратыўна – прыкладной творчасці






# Школьны музей дэкаратыўна – прыкладной творчасці





# Чырвоны куток

Традыцыйна пачнем нашу экскурсію з чырвонага кутка. У кожнай сялянскай хаце менавіта тут знаходзіліся абразы, упрыгожаныя вышыванымі ручнікамі . Аӯтарам гэтага ручніка з’яӯляецца жанчына Ганна , а вышыӯка на ручніку датуецца 1880 годам. Гэта ручнік-набожнік, якому прыкладна 137 гадоӯ. Яго канцы злучаны і ӯпрыгожаны карункамі.



# Ручнікі

У нашым музеі даволі шмат ручнікоў: ёсць ручнік-уціральнік, вясельны ручнік, а таксама сучасныя тканыя і вышывныя ручнікі.





# Вышываныя палотны

На супрацьлеглай сцяне знаходзяцца вышываныя палотны. Сярод іх ёсць сюжэтныя, напрыклад, “Зімовы вечар” і прадметныя, напрыклад, “Кот” і “Букет”. Палотны ў асноўным вышыты крыжыкам. Раней яны, узятыя ў рамкі, служылі ўпрыгожваннем хат нашых продкаў.



# Зімовы вечар.
# Вышыўка крыжыкам



# Вышыўка крыжыкам






# Гладзь



# Вясельнае плацце

Даволі даўні экспанат музея – вясельнае жаночае плацце з вышыўкай.



# Ільняная сарочка

Каштоўны экспанат нашага музея – ільняная жаночая сарочка з вышытым каўняром, манішкай і рукавамі. Экспанату таксама больш за 100 гадоў. Усе аперацыі па стварэнні такой сарочкі зроблены ўручную. Нават швы выкананы ніткай з іголкай, але вельмі акуратна і роўненька. Такія сарочкі насілі не толькі жанчыны, але і мужчыны.



# Фартухі

Раней нашы жанчыны насілі такія прыгожыя святочныя фартухі, вышытыя чырвона-чорнымі ніткамі, якія гаспадыні фарбавалі самі, выкарыстоўваючы для гэтага адвары розных раслін.



# Падзорнікі

Ложак нашы продкі упрыгожвалі ***падзорнікамі***, вышытымі гладдзю і акаймаванымі карункамі.





# КУФАР

У куфры захоўваліся **сувоі** вытканых палотнаў, вопратка, бялізна, вышываны дзявочы пасаг



Гэты куток нашага музея прысвечаны ткацкай справе. Тут ёсць прыстасаванні для ткацкага станка, пралка і, нават, клубкі пражы.



# Ільняныя валокны

Вось тут прадстаўлены ільняныя валокны, якія трэба было захаваць нейкі час у выглядзе васьмёркі і кос



Вырабамі ткацкага станка з’яўяюцца не толькі палотны, але і палавікі, на якіх вы стаіцё, посцілкі, якімі засцілалі ложкі.





# Прылады працы

Для абмалочвання зерня нашы продкі карысталіся драўлянымі цапамі, а хлеб саджалі ў печ з дапамогай драўлянай лапаты



Ніжні ярус нашага музея прадстаўлены драўлянымі бытавымі прыстасаваннямі: валок, пранік, маслабойка, карыта, сіта.



Для апрацоўкі драўніны выкарыстоўвалі вярстак і рубанак



# Плеценыя вырабы

Таксама экспанатамі нашага музея з’яӯляюцца плеценыя вырабы з саломы - карабы для разнастайнага прызначэння.



# Лапці

З лазы плялі кашы, а з лыка – лапці






# Бандарныя вырабы

З бандарных вырабаў – бочка для саленняў



Супрацьлеглы бок прадстаўляе экспанаты бытавога прызначэння: прас на вуглях, лямпы – газоўкі, бязмен, ліхтары







# Сялянскі быт

Заканчвае нашу аглядавую экскурсію стэнд “Сялянскі быт”, дзе прадстаўлены фатаздымкі тых бытавых прадметаў, якія на жаль, няма ў нашым музеі.



# Экскурсію праводзілі:

**Каваленка Маргарыта**



**Хмялеўская Аліна**









# В і к т а р ы н а

1. Чым карысталіся нашы продкі для абмалочвання зерня?

# Драўляным цэпам



# 2. Што захоўвалі гаспадыні у куфры?

# Палотны, вопратку, бялізну



3. Якімі прыстасаваннямі карысталіся для апрацоўкі драўніны?

# Вярстак і рубанак



**4. З чаго плялі лапці? А кашы?**





З лыка

З лазы

4. Як называецца рэч, якой упрыгожвалі ложак?

# Падзорнік



4. Як называлася месца ў хаце, дзе знаходзіліся абразы, упрыгожаныя вышыванымі ручнікамі?

# Чырвоны куток



Як добра, што музей  наш ёсць
у школе!
Значыць, сувязь з часам не
згубіць.
Значыць, разам на жыццёвым
коле
Зможам мы мінулае ўзнавіць.